ПРАЕКТ «ЛЮБАНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ»

# Крывавы ашчэр «Русалкі»

**24 лютага 1943 года гітлераўцы распачалі карную аперацыю, якой далі кодавую назву «Nixe» – «Русалка».**

Акупанты ставілі перад сабой мэту разграміць партызанскія злучэнні, што базіраваліся і дзейнічалі на мяжы Мінскай і Палескай абласцей – на тэрыторыі Жыткавіцкага, Петрыкаўскага, Капаткевіцкага, Любанскага і Старобінскага раёнаў. «Русалка» была працягам карнай аперацыі «Hornung» – «Люты», якую фашысты крыху раней праводзілі ў суседніх рэгіёнах.

Што такое генацыд у самых зверскіх, самых жудасных, самых бесчалавечных праявах, жыхары Любаншчыны добра зведалі вясной 1942 года, калі і на нашай зямлі гітлераўцы разгарнулі буйную карную аперацыю «Bamberg» – «Бамберг». Тады толькі за першыя чатыры дні красавіка фашысты спалілі, расстралялі, павесілі каля чатырох тысяч чалавек. Значна папоўніла жалобны спіс ахвяр і карная аперацыя №6, якую акупанты праводзілі летам 1942-га.

Адказам на жахлівыя злачынствы захопнікаў стаў значны рост шэрагаў народных мсціўцаў, істотнае павелічэнне эфектыўнасці іх дзеянняў. Так, напрыклад, у ноч на 3 лістапада 1942 года партызаны здзейснілі буйную баявую аперацыю «Рэха на Палессі» – узарвалі чатырохпралётны чыгуначны мост даўжынёй больш за сотню метраў праз раку Пціч непадалёку ад аднайменнай станцыі. А крыху пазней, 9 снежня, народныя мсціўцы Мінска-Палескага злучэння падарвалі саракаметровы мост праз раку Бобрык паміж станцыямі Капцэвічы і Муляраўка.

А вось адзін з баявых эпізодаў, пра які пасля вайны ўспамінаў Арцём Лескін, былы начальнік штаба 25-й партызанскай брыгады імя Панцеляймона Панамарэнкі:

– Нямецкае камандаванне 10 лютага 1943 года на станцыі Капцэвічы высадзіла карную экспедыцыю колькасцю да паўтары тысячы чалавек з мінамётамі і артылерыяй. Немцы павялі наступленне ў накірунку вёсак Сялюцічы-Грабаў. 13 лютага камандзір брыгады Аляксандр Далідовіч загадаў атрадам выступіць на дапамогу атраду Рыгора Краўчанкі, які атакавалі фашысты, і заняць пазіцыі ў раёне вёскі Белы Пераезд. На вёску Фаставічы праціўнік кінуў пяхоту, якую атрад Івана Чарнышова абстраляў з засады. Немцы бой не прынялі, спыніліся і занялі абарону. Асноўныя ж сілы гітлераўцаў якраз і рушылі на Белы Пераезд. Мы акапаліся на выгадным рубяжы. Атрад Рыгора Плышэўскага размясціўся па фронце перад палянай. Атрады Мацвея Фурмана, Івана Хімічова і Дзмітрыя Бародзькі – справа ад дарогі, атрады Рыгора Краўчанкі і яшчэ аднаго камандзіра – злева. Такім чынам мы ўтварылі традыцыйны «мяшок». Калона праціўніка ў яго і трапіла. Наш нечаканы ўдар дасягнуў мэты: у немцаў узнікла паніка, яны адступілі і да канца дня не прадпрымалі ніякіх дзеянняў. Страты немцаў мы вызначыць не змаглі.

Увогуле, калі чытаць дзённікі, якія вялі (хоць і забаранялася) некаторыя партызанскія камандзіры (скажам, Аляксандр Далідовіч або Казімір Пушчын) ці байцы (дапусцім, Міхаіл Жалтоў), разумееш, што народныя мсціўцы амаль штодня выходзілі на якое-небудзь заданне. То грамілі нямецка-паліцэйскія гарнізоны, то ладзілі засады на шляху варожых падраздзяленняў, то пускалі пад адхон эшалоны акупантаў, то ўзрывалі або разбіралі рэйкі на чыгунцы, то парушалі сувязь. А тут яшчэ ў студзені 1943 года ў тыле гітлераўцаў пачалі рэгулярна друкавацца «Звязда» і «Чырвоная змена» – магутныя сродкі ўздыму насельніцтва рэспублікі на барацьбу з захопнікамі.

Самі фашысты адзначалі, што ў пачатку 1943-га Палессе стала тэрыторыяй, дзе была фактычна адноўлена савецкая ўлада. Тут дзейнічалі мясцовыя Саветы, дзеці вучыліся ў савецкіх школах, ішла мабілізацыя ў партызанскія атрады, зноў жа рэгулярна на пабудаваных аэрадромах прымалі самалёты з Вялікай зямлі, у перапынках паміж баявымі аперацыямі народныя мсціўцы дапамагалі сялянам сеяць і ўбіраць хлеб, узводзілі ўмацаванні ў лясах і балотах. З усім гэтым трэба было нешта ж рабіць!



Марыя Якаўлеўна **МІНЦ, падрыўнік партызанскага атрада імя Гастэлы.**



Канстанцін Васільевіч **ВАЯВОДЗІН, камандзір падрыўной групы партызанскага атрада імя Сільніцкага.**



Дзмітрый Парфёнавіч **БАРОДЗЬКА, камандзір партызанскага атрада імя Кутузава.**

Тады і з’явіўся план карнай аперацыі пад кодавай назвай «Русалка» (дарэчы, такі пераклад слова «nixe» будзе не зусім дакладны: nixe – гэта вадзяная німфа ў германскай і скандынаўскай міфалогіях, што, зрэшты, крывавай, варварскай сутнасці самой дзеі не мяняе). І на станцыях Жыткавічы, Лунінец пачалі выгружацца эшалоны з жывой сілай і тэхнікай гітлераўцаў: у аперацыі ўдзельнічала да дваццаці батальёнаў карнікаў.

Здарылася так, што паміж камандаваннем прыбыўшых войскаў і кіраўніцтвам акупаваных тэрыторый узніклі рознагалоссі наконт маштабаў, тэрмінаў правядзення «Русалкі».

**У сітуацыю ўмяшаўся сам рэйхсфюрэр СС Гімлер: маўляў, аперацыя праводзіцца па маім загадзе, таму выконвайце запланаванае бясспрэчна. Такое заступніцтва давала карнікам поўную свабоду дзеянняў. І на Палессі запалалі населеныя пункты...**

Вось запісы за 1943 год з дзённіка (ён захоўваецца ў фондах Любанскага музея народнай славы) Міхаіла Жалтова, партызана атрада імя Яўстрата Гарбачова брыгады №25 імя Панцеляймона Панамарэнкі: «14 лютага-1 сакавіка. Усе гэтыя дні жылі трывожна. Вакол ноччу бачны пажарышчы – гараць вёскі. Карнікі бязлітасна распраўляюцца з насельніцтвам. 1-12 сакавіка. За гэты час брыгада два разы вяла баі з карнікамі, забіта немцаў каля сотні чалавек. Нашых страт амаль няма, акрамя некалькіх параненых. Немец падпаліў усе бліжэйшыя вёскі – Гарадзяцічы Вялікія і Малыя, 5-ю Брыгаду, Кузьмічы і іншыя.

**Мірных жыхароў зганяюць у гумно або ў адзін дом, забіваюць наглуха дзверы ды вокны і падпальваюць... Пасля крывавай расправы жудасна падысці да месца, дзе была вёска. Трупы гніюць, і няма каму іх закапаць. Гэткай дзікасці яшчэ не ведае гісторыя чалавецтва...**

Немец бамбіць з самалётаў вёскі, якія яму не ўдалося спаліць».

Так, гітлераўцы мелі мэтай разграміць Мінска-Палескае партызанскае злучэнне. Так ды не так! Менавіта «Hornung» і «Nixe» вызначылі характар усіх карацельных акцый, якія фашысты праводзілі ў Беларусі з лютага 1943 года – татальны тэрор, пагалоўнае вынішчэнне жыхароў населеных пунктаў, знішчэнне эканамічнай і прадуктовай базы для партызанскага руху. З таго моманту масавая ліквідацыя цывільных стала ў акупантаў паўсюднай практыкай.

Арцём Лескін успамінаў:

– Да выходу дня 15 лютага часткаю сваіх сіл праціўнік заняў вёску Ветчын і да 2 сакавіка прачэсваў навакольныя населеныя пункты, знішчаў іх разам з жыхарамі, забіраў хатнюю жывёлу, хлеб, інвентар і асабістыя рэчы людзей. Праходзілі кароткія сутычкі з партызанамі.

У суцэльныя галавешкі ператварыліся вёскі Пагной, Дворышча, Дварэц, Прыклінец, Абоз, пасёлак Гуляева. Варта заўважыць, што некаторыя з тых населеных пунктаў аказаліся... амаль пустымі. Усё ж такі на Любаншчыне была партызанская зона: цывільныя, папярэджаныя народнымі мсціўцамі аб карнай аперацыі захопнікаў, пакідалі вёскі, хаваліся ў лясах ды балотах, ішлі пад абарону партызанаў.

І.І. Дайнека, жыхар Старасека, прыгадваў:

– У мяне заўсёды стаялі напагатове калёсы. Як толькі аб’яўлялі трывогу, я адразу запрагаў каня, браў самае неабходнае – адзенне, прадукты – і з усёй сям’ёй спяшаўся ў лес, дзе ў самых глухіх месцах загадзя былі падрыхтаваны сховішчы. Так у трывозе і страху вандравалі ўсю вайну...

Аналагічным чынам паводзілі сябе многія любанчане.

У фондах Любанскага музея народнай славы маецца цікавы здымак: жыхары вёскі Дварэц сфатаграфаваны ў «запасной» вёсцы Давыдаўцы. У тым самым «загадзя падрыхтаваным сховішчы», якое размяшчалася непадалёку ад базы партызанскага атрада імя Дзяніса Давыдава (адсюль і назва). Туды ўцякалі людзі, калі ў навакольных мясцінах з’яўляліся карнікі.

Так, канешне, удавалася ратавацца не ўсім. У спаленых падчас правядзення «Русалкі» Дворышчах загінула дзевяць жыхароў, у Малых Гарадзяцічах – васямнаццаць (фашысты ледзь не пад корань вынішчылі мясцовыя сем’і Вішнеўскіх, Вярбіцкіх, Трубчыкаў, Цішко), у Прыклінцы – чатыры. А вось радкі з данясення 25-га паліцэйскага батальёна, які ўдзельнічаў у карнай аперацыі «Nixe», ад 2 сакавіка 1943 года: «Знішчана 696 асоб, падазраваных у дачыненні да бандаў. Уласных стратаў няма». Гэты ж батальён нарабаваў у мірнага насельніцтва трыста хатніх жывёлін, пяцьдзясят цэнтнераў пшаніцы і шмат іншай людской маёмасці.

І яшчэ адзін трагічны вынік «Русалкі»: больш за тысячу юнакоў і дзяўчат было схоплена карнікамі для вывазу на катаржныя работы ў Германію. Многія са схопленых не дажылі да Вялікай Перамогі ў фашысцкай няволі...

Гітлераўцам не ўдалося дабіцца поспеху ў барацьбе з народнымі мсціўцамі. Нават у разгар карнай аперацыі партызаны выходзілі на заданні. Так, напрыклад, у дзённіку Аляксандра Далідовіча, камандзіра партызанскай брыгады №25 імя Панцеляймона Панамарэнкі, запісана: «27 лютага, субота. Падрыўнікі ў колькасці васьмі чалавек з атрада Фурмана падарвалі нямецкі воінскі эшалон з цыстэрнамі бензіну, боепрыпасамі і жывой сілай, які ішоў у бок фронта. У выніку крушэння знішчаны паравоз, разбіты два пасажырскія вагоны, сем таварных, шэсць бензацыстэрнаў. Забіта да сарака немцаў. На зваротным шляху група зняла чатырыста метраў тэлефоннага кабелю між вёскамі Ветчын і Грабаў». І падобных запісаў нямала.

Афіцыйна «Русалка» скончылася 1 сакавіка. Але карнікі яшчэ і ў першым месяцы вясны 1943-га лютавалі на Любаншчыне і ў суседніх раёнах. Скарыць, запужаць тутэйшых люд не атрымалася. Наадварот, «Nixe» выклікала новы магутны ўсплеск росту шэрагаў народных мсціўцаў: на нашай тэрыторыі стварылася некалькі новых партызанскіх атрадаў. Зрэшты, гэта ўжо тэма наступнага аповеда.

**Сяргей КВІТКЕВІЧ, навуковы супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**